**Аматары гісторыі і краязнаўства даведаліся пра падрабязнасці маштабных раскопак ва ўсходняй частцы Верхняга замка.**

> Удалося ўстанавіць, што вал на тэрыторыі Верхняга замка з'явіўся не пазней за другую палову XI ст., прыкладна ў гады праўлення Усяслава Чарадзея.

# Адкрываючы старажытныя таямніцы

**У ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай** адбылася публічная **лекцыя старшага навуковага супрацоўніка** аддзела археалогіі полацкай зямлі і сумежных тэрыторый інстытута гісторыі НАН Беларусі, дацэнта, **кандыдата гістарычных навук Марата Клімава.**

Маштабныя раскопкі занялі 179 дзён і завяршыліся 27 ліпеня мінулага года. Упершыню была ўзведзена спецыяльная ўкрыўная канструкцыя, якая дазволіла праводзіць раскопкі і падчас дажджу, снегападу, вясновых паводак.

Нягледзячы на ўсе акалічнасці, даследавалі драўляныя забудовы XIII-XI стст., а таксама рэшткі маставых, дваровых вымастак, кладак, вастраколаў, прыступак. Дзякуючы блізкаму заляганню грунтавых вод, дрэва выдатна захавалася. *«Я ўпэўнены, што крынічка, якая зараз б'е недалёка ад Сафійскага сабора, існавала яшчэ ў тыя даўнія часы і была больш актыўнай. Мы знайшлі вадасцёк, па якім грунтавыя і дажджавыя воды выдаляліся з пляцоўкі жыццядзейнасці»,* — паведаміў навуковец. А так званая кансерватыўнасць забудовы, калі пад рэшткамі драўляных будынкаў выяўляюцца іншыя, дазволіла здымаць іх адзін за адным.

Нагадаем, раней была знойдзена толькі верхняя частка вала, таму выказвалася меркаванне, што ён існаваў толькі з XIV ст. Удакладненне храналагічных вехаў развіцця Полацка Марат Клімаў лічыць адным з галоўных вынікаў археалагічных раскопак.





Гэта было адкрытае гандлёва-рамеснае паселішча. Фрагменты шаляў і гіркі-разнавагі, манеты, у тым ліку арабскія срэбраныя дзірхемы і візантыйскія бронзавыя фолісы, сведчаць аб тым, што там жылі даволі заможныя людзі.

Увогуле, падчас археалагічных раскопак знайшлі больш за 3000 артэфактаў. Іх каштоўнасць ацэньваецца не тым, з якога яны матэрыялу, а значнасцю высноў, якія робяць гісторыкі. У сваю чаргу пра разнастайнасць рэчаў сведчаць, напрыклад, знаходкі аднаго дня: шпора, каса-гарбуша, прылада для верацяна, шкляны бранзалет, косткі для гульні. Драўляных донцаў, керамічных гаршкоў, вырабаў са скуры таксама было шмат. *«Раскопкі дазволілі сабраць самую вялікую калекцыю лучын на тэрыторыі Беларусі»,* — сказаў Марат Клімаў. Знаходзілі і плінфу — старажытную абпаленую цэглу. Адметна, што для полацкай плінфы характэрна размяшчэнне знакаў, літар, клеймаў. Каменныя ліцейныя формы сведчаць пра развіццё ювелірнай вытворчасці, фрагменты кальчугі, зброі і чалавечых костак — пра ваенныя сутыкненні. Быў знойдзены і крыж-энкалпеон, такіх на тэрыторыі Полаччыны раней не выяўлялі.

Сярод найбольш выбітных гістарычных знаходак варта адзначыць падвескі з «малаточкамі Тора» (старажытнымі воінскімі скандынаўскімі кудменямі), наканечнікі з выявамі, металічныя фрагменты патэльняў, накладка-матрыца на твар.

Сувязь часоў і пераемнасць пакаленняў — аснова патрыятычнага выхавання моладзі і падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў. Марат Клімаў падзякаваў усім, хто прымаў удзел у археалагічных раскопках: студэнтам-гісторыкам ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай пад кіраўніцтвам старшага выкладчыка кафедры гісторыі і турызму Аляксея Коца, навучэнцам Полацкага дзяржаўнага хіміка-тэхналагічнага каледжа, а таксама членам археалагічнай брыгады, якая складалася з вольнанаёмных працоўных. Навуковец адзначыў, што раскопкі знайшлі сур'ёзную падтрымку з боку кіраўніцтва раёна.

Матэрыялы раскопак будуць прадстаўлены ў навуковых работах.

> Удакладняе старажытную гісторыю Полацка і той факт, што ва ўсходняй частцы Верхняга замка, на паселішчы, якое размяшчалася недалёка ад сучаснага Сафійскага сабора, жылі вікінгі.



Фота з архіва «ПВ».

**Святлана АКСЯНОВІЧ.**
**Фота Маргарыты БАРАНОК.**